Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Год выд. XX
№ 14 (664)
ПЯТНІЦА
14
красавіка
1967 года

Цана 2 кап.

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## КАНТРОЛЬ І ПРАВЕРКА — ГАЛОЎНАЕ

Партыйная арганізацыя хімічнага факультэта ў параўнанні з іншымі невялікая. У яе складзе 51 камуніст, у тым ліку 50 членаў КПСС. А задачы перад партыйнай арганізацыяй стаяць вельмі вялікія. Яны абумоўлены ўсё узрастаючай колькасцю студэнтаў, павышэннем патрабавальнасці да вучэбна-педагагічнага працэсу ў акадэмічных групах, а таксама да навуковай дзейнасці прафесарска-выкладчыцкага калектыву. У гэтых умовах партыйнае бюро факультэта імкнецца да таго, каб расставіць сілы партыйнай арганізацыі рацыянальна і не ўпусціць з поля зроку ніводнае пытанне з жыцця факультэта. Менавіта таму асаблівае значэнне набывае вызначэнне для кожнага камуніста канкрэтнага партыйнага даручэння і кантроль за іх выкананнем.

Каб зрабіць выкананне партыйных даручэнняў дзейсным, у першую чаргу самыя важныя участкі партыйнай работы мы даручылі членам партбюро. Так, член партыйнага бюро А. Гусеў адказвае за ідэалагічную работу на факультэце. Ён сістэматычна наведвае работу гурткоў партыйнай асветы, сочыць за арганізацыяй масавых мерапрыемстваў ідэйна-палітычнай работы са студэнтамі, часта бывае ў інтэрнатах, заўсёды прысутнічае на пасяджэннях камітэта камсамола. Член партбюро А. Артамонаў нястомна клапоціцца аб падрыхтоўцы і арганізацыі партыйных сходаў, сочыць за прыёмам у кандыдаты і члены партыі. Адначасова ён праводзіць вялікую работу з маладымі камуністамі, дапамагае ім засвоіць Статут КПСС, глыбока вывучыць Праграму партыі.

Растаноўка членаў партыйнага бюро на адказных участках грамадскай работы, добрасумленнае выкананне імі сваіх партыйных даручэнняў дазваляе партыйнаму бюро прад'явіць да кожнага члена партыі высокую патрабавальнасць, ажыццяўляць паўсядзённы дзейсны кантроль за ходам выканання ўсяго складанага комплексу партыйных даручэнняў. Дзякуючы гэтаму, пераважная большасць камуністаў партыйнай арганізацыі выконвае абавязкі добрасумленна, з пачуццём высокай адказнасці.

Гэта ў першую чаргу адносіцца да камуністаў Ю. Гусева, які вядзе вялікую палітычна-масавую работу са студэнтамі у інтэрнаце па вуліцы Свярдлова, І. Ігнаценка, які з'яўляецца членам групы народнага кантроля, І. Царук, адказваючай за работу з маладымі камуністамі, Г. Мартыновіч, працуючай з замежнымі студэнтамі і іншыя.

Разам з тым члены партыйнага бюро разумеюць, што без паўсядзённага кантролю за ходам выканання партыйных даручэнняў, нельга дабіцца колькі-небудзь значных поспехаў. Так, толькі за апошні час была заслухана дзейнасць камуністаў (адказны А. Баркан) па выпуску насценнай газеты, камуніста В. Камарова за кіраўніцтва агіткалектывам хімфака і г. д.

Аднак пры усім тым станоўчым, чаго мы дабіліся ў пастаноўцы выканання партыйных даручэнняў мы ўсё ж разумеем, што ў гэтай справе ў нас ёсць і недахопы. У прыватнасці, нам трэба прыняць усе захады, каб павысіць паспяховасць студэнтаў, якая знаходзіцца, на жаль, не на належным узроўні, палепшыць спартыўную работу, умацніць кантроль за навуковай дзейнасцю прафесарска-выкладчыцкага калектыву. Усведамляючы свае недахопы, мы прымем усе меры, каб выправіць іх і дастойна сустрэць 50-годдзе Вялікага Кастрычніка.

П. СІЛІВАНЧЫК,
сакратар партбюро хімфака.



Многа новых адкрыццяў пазнаюць хімікі ў час даследаванняў у лабараторыях, якія дапамагаюць эфектыўней замацоўваць тэарэтычныя навыкі, глыбей пранікаць у тайны хіміі.

На здымку: студэнт другога курса Аляксандр Лазарчык за даследаваннямі ў лабараторыі.

●



Ідзе лекцыя ў першакурснікаў-матэматыкаў. Яна не першая ў іх і не апошняя. Колькі іх яшчэ прыйдзецца наведваць ім, старанна заканспектоўваючы кожнае слова выкладчыкаў, каб стаць высокакваліфікаваным спецыялістам...

Фота А. Кадзета.

## У ШКОЛЕ МАЛАДЫХ КАМУНІСТАЎ

ПАРТЫЙНАЕ бюро гістарычнага факультэта ўдзяляе вялікую увагу ідэйна-палітычнаму выхаванню маладых камуністаў. Так, ужо некалькі гадоў дзейнічае школа па рабоце сярод маладых камуністаў, якой кіруе член партбюро, старэйшы камуніст прафесар Фёдар Макаравіч Нячай. Вывучэнне Статута і Праграмы КПСС, дыскусіі па важнейшых праблемах жыцця нашай краіны і міжнародных падзей, гутаркі аб маральным абліччы маладога чалавека, сустрэчы з цікавымі людзьмі—далёка няпоўны пералік мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў гэтай школе.

Вось і днямі у школе адбылася сустрэча маладых камуністаў з сакратаром Мінскага гаркома партыі тав. Лежапёкавым, які выступіў са змястоўным дакладам аб задачах гарадской партыйнай арганізацыі ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем Вялікага Кастрычніка і 900-годдзем горада Мінска.

Тав. Лежапёкаў, у прыватнасці, расказаў, як працоўныя горада Мінска ажыццяўляюць рашэнні XXIII з'езда КПСС, аб новых поспехах у развіцці ўсіх галін народнай гаспадаркі і далейшым павышэнні матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню жыцця народа. Напрыклад, гадавы план прамысловай вытворчасці ў 1966 годзе ў цэлым і па важнейшых відах вырабаў перавыканан. За кошт дзяржаўных сродкаў, а таксама сродкаў рабочых і служачых у горадзе ўведзены ў эксплуатацыю жылыя дамы агульнай плошчай больш як 558 тысяч квадратных метраў. Вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы горада выпусцілі 13 тысяч спецыялістаў, з іх з вышэйшай адукацыяй 7,5 тысяч. У ВНУ і тэхнікумы г. Мінска будзе прынята ў гэтым годзе больш 26 тысяч чалавек, або на 2,2% больш, чым у 1965 годзе.

Дакладчык у сваёй гутарцы звярнуў асаблівую ўвагу на выхаванне высокіх маральных якасцей маладых камуністаў і ўсёй моладзі.

У канцы свайго выступлення тав. Лежапёкаў адказаў на шматлікія пытанні маладых камуністаў, якія ўзніклі ў час гутаркі. Маладыя камуністы выказалі задавальненне сустрэчай з вопытным партыйным работнікам.

Э. Віктараў.

## ЗАПАРУКА ПОСПЕХАЎ

Важнае месца ў рабоце вышэйшай навучальнай установы адыгрывае праблема кадраў, правільная растаноўка іх на адказных участках працы. Гэтыя і многія іншыя пытанні вырашаліся на нядаўнім партыйным сходзе філалагічнага факультэта (сакратар С. А. Гусак). Выступаўшыя адзначылі, што прафесарска-выкладчыцкі калектыў размеркаваны па сваіх месцах у асноўным правільна. Кожны з іх працуе там, дзе ён можа прынесці больш карысці ў выхаванні студэнцкай моладзі, больш поўна праявіць свае індывідуальныя якасці і здольнасці. У цяперашні час на філфаку 8 дактароў навук, паспяхова працуюць над доктарскімі і яшчэ некалькі выкладчыкаў, многія прадставілі да абароны кандыдацкія дысертацыі.

Выступіўшы ў спрэчках дацэнт кафедры тэорыі і практыкі партыйнага друку М. С. Зярніцкі адзначыў, што прафесары і выкладчыкі факультэта многа працуюць над павышэннем сваёй кваліфікацыі. У авангардзе гэтых спраў знаходзяцца камуністы. Карысных спраў з кожным днём становіцца ўсё больш і больш. Яны з'яўляюцца запарукай паспяховага выканання сацыялістычных абавязацельстваў факультэтам, узятых у гонар 50-годдзя Савецкай улады. Палепшылася і работа з маладымі камуністамі. Праводзяцца гутаркі аб гісторыі партыі, слаўных яе сынах, самаадданай рабоце членаў КПСС у будаўніцтве камуністычнага грамадства, сустрэчы з ветэранамі рэвалюцыі і іншае.

Дэкан філфака дацэнт Р. В. Булацкі ў сваёй прамове гаварыў аб тым, што падрыхтоўка высокакваліфікаваных кадраў патрабуе ад кожнага прафесара, выкладчыка напружанай працы і, перш за ўсё, павышэння патрабавальнасці да студэнтаў.

— У нас усё яшчэ на некаторых курсах,—адзначыў дэкан,—немалы працэнт пропускаў лекцый па марксісцка-ленінскай філасофіі. У час апошняй праверкі высветлілася, што з двух груп адсутнічае 10 чалавек, акрамя гэтага 7 спазнілася...

Сход прайшоў арганізавана. У прынятай рэзалюцыі адзначана, што юбілейны год патрабуе ад кожнага асаблівага старання і напружанай працы ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў, што зачынальнікамі ўсяго лепшага на факультэце павінны стаць камуністы.

С. РАБЦАЎ.

ІНТЭРВ'Ю ДАЕ ДЭКАН БІЯФАКА

## ІМ ІСЦІ Ў СТАГОДДЗЕ

НА БІЯЛАГІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ ДНЯМІ АДБЫЛОСЯ РАЗМЕРКАВАННЕ МАЛАДЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ НА ПРАЦУ. З ГЭТАГА ВЫПАДКУ НАШ КАРЭСПАНДЭНТ ГЕНАДЗЬ МАЦУК УЗЯЎ ІНТЭРВ'Ю Ў ДЭКАНА ФАКУЛЬТЭТА П. Г. ПЯТРОВІЧА.

ЯК ПРАЙШЛА АБАРОНА ДЫПЛОМНЫХ?

Абарона дыпломных работ у гэтым годзе прайшла арганізавана. Тэмы большасці навуковых прац былі звязаны з вытворчасцю, з практычнымі даследаваннямі па самых розных галінах біялогіі. Трэба адзначыць, што працавалі дыпламанты старанна і таму большая частка з іх абаранілася на выдатна. Гэта дае поўнае права меркаваць аб тым, што кантынгент выпускаемых факультэтам спецыялістаў у гэтым годзе кваліфікаваны. Для гэтага многа намагання прыклаў увесь прафесарска-выкладчыцкі калектыў, кафедры. Мы усе добра сабе ўяўлялі тое, што гэтыя выпускнікі павінны быць асаблівымі ва ўсіх адносінах, яны ж атрымліваюць дыпломы ў юбілейным годзе, калі ўвесь савецкі народ рыхтуецца сустрэць Пяцідзесяцігоддзе Вялікага Кастрычніка. Падрыхтаваныя намі высокакваліфікаваныя спецыялісты-біёлагі—гэта наш падарунак 50-годдзю Савецкай улады...

КОЛЬКІ СТУДЭНТАЎ У ГЭТЫМ ГОДЗЕ ЗАКОНЧВАЕ БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ І КУДЫ ЯНЫ НАКІРАВАНЫ НА ПРАЦУ?

Яшчэ далёка да размеркавання дэканат з партыйным бюро, камітэтам камсамола і іншымі грамадскімі арганзіацыямі сумесна прадумалі схільнасці кожнага выпускніка, да той ці іншай галіны працы, яго магчымасці, паводзіны і паспяховасць на працягу пяці год навучання. Гэта дало нам магчымасць падыйсці да гэтага важнага пытання аб'ектыўна. На яго мы таксама запрасілі прадстаўніка з Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. На размеркаванне было прадстаўлена 55 студэнтаў. Вядома, гэта вельмі маленькая лічба для таго, каб забяспечыць і вялікія запатрабаванні школ рэспублікі ў біёлагах і вытворчасць, бо тыя і другія з кожным годам патрабуюць біёлагаў усё больш і больш. 28 выпускнікоў, у асноўным дзяўчаты, праявілі жаданне працаваць на педагагічнай рабоце, таму яны былі накіраваны ў школы. Восем па просьбе розных харчовых прадпрыемстваў накіраваны на вытворчасць Дзесяць атрымалі свабодныя дыпломы.

Сярод выпускнікоў было нямала такіх, якія шмат працавалі ў розных навуковых гуртках, яны за час вучобы зрабілі многа цікавых даследаванняў і праявілі старанне да навуковай працы. Іх часткова мы накіравалі на працу ў Акадэмію навук БССР малодшымі навуковымі супрацоўнікамі, а Філімонава, Чарнавуза, Ліня пакінулі на вучобу ў аспірантуры.

А ЯК ПРАЙШЛО РАЗМЕРКАВАННЕ ЗАВОЧНІКАЎ І ВЯЧЭРНІКАЎ?

Завочнікі ў асноўным усе працуюць у школах і некаторыя на вытворчасці і пакінуты па месцах сваёй працы, а вось з вячэрнікамі справа цяжкая. Многія з іх працуюць не па спецыяльнасці токарам ці слесарам, шаферам ці будаўніком і іншых спецыяльнасцях. Ехаць працаваць біёлагам з Мінска яны не жадаюць.

Хаця гэтае пытанне, на якім я хачу спыніцца і не адносіцца непасрэдна да тэмы інтэрвью, але нам трэба больш пільна і старанна адносіцца да прыёму моладзі ва універсітэт. Дрэнна, што вясковая моладзь горш вытрымлівае конкурс ва універсітэт з таго выпадку, што мінчане лепш падрыхтаваны з тым улікам і спецыфікай, што наведвалі падрыхтоўчыя курсы і таму здараецца так, што таленавітая вясковая моладзь аказваецца за сценамі універсітэта. Мне здаецца, што у час прыёмау у гэтым годзе нам трэба праявіць асаблівую увагу

А ЦЯПЕР МНЕ ХОЧАЦЦА ПАЖАДАЦЬ СВАІМ ВЫХАВАНЦАМ ШЧАСЛІВАЙ ДАРОГІ У НОВАЕ ЖЫЦЦЁ. НЯХАЙ ПРАЦА БУДЗЕ ЗАЎСЁДЫ ПЛЁННАЙ І СТАРАННАЙ, НЯХАЙ ЯНЫ НІКОЛІ НЕ ЗАБЫВАЮЦЬ, ШТО ЗАКОНЧЫЛІ АРДЭНАНОСНЫ УНІВЕРСІТЭТ!

# АГУЛЬНАЯ РАДАСЦЬ

**Многія калектывы фізічнай культуры рэспублікі змагаліся за лепшую пастаноўку фізкультурна-масавай, аздараўленчай і спартыўнай работы. Сярод іх быў і наш універсітэт. І вось нядаўна падведзены вынікі. За добрыя паказчыкі ў развіцці спорту, паспяховае выступленне спартсменаў БДУ на рэспубліканскай арэне калектыў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна ўзнагароджаны Граматай Савета Саюза спартыўных арганізацый БССР. За заслугі і праяўленыя клопаты ў развіцці спорту і аздараўленчай рабоце Граматамі Савета саюза спартыўных арганізацый узнагароджаны таксама рэктар універсітэта, заслужаны дзеяч навукі БССР, акадэмік А. Н. Сеўчанка, загадчык кафедры фізвыхавання В. П. Шапялевіч, старшыня праўлення спартыўнага клуба БДУ М. А. Шэйнеман.**

# ПЕРАМАГАЕ МУЖНАСЦЬ І ВЫНОСЛІВАСЦЬ

У плане падрыхтоўкі да рэспубліканскай студэнцкай спартакіяды мужчынская і жаночая зборныя каманды па валейболу нашага універсітэта сустрэліся ў таварысцкім матчы са студэнцкімі камандамі гарадоў Вільнюса і Каўнаса. У горадзе Вільнюсе нашымі сапернікамі былі студэнты мясцовага універсітэта.

Першымі на пляцоўку выйшлі каманды дзяўчат. Спачатку ігра складваецца няўдала для нашай каманды. Фактычна толькі Тома Барысава і Люда Антонава могуць вынікова атакаваць у нашай камандзе. Да гэтага яшчэ не клеіцца ігра ў абароне. Але патрэбна мець мужнасць змагацца да канца з любой камандай. А валявая падрыхтоўка аказалася ў нашых дзяўчат на нізкім узроўні. Гэтую сустрэчу яны прайгралі саперніцам з лікам 0:3.

Потым на пляцоўку выйшлі мужчынскія каманды. Нашы рабяты вельмі сабрана правялі ігру. Літоўскія сябры не маглі закрыць блокам нашых нападаючых. Удары Юры Васільева і Лёні Гваздзя ўвесь час дасягалі мэты. Удачна згулялі нашы пасаўшчыкі Сяргей Стральцоў і Віця Рабаў. Рахунак ігры 3:1.

На наступны дзень гэтыя каманды сустрэліся зноў. І на гэты раз нашы рабяты не падвялі. Зноў перамога. Дзяўчаты прайгралі. Але на гэты раз гульня была больш напружанай. Самааддана згуляла ў абароне Ядзя Цыбульская. Нягледзячы на паражэнне, гэтая гульня прынесла задавальненне і ўпэўненасць у свае сілы.

Наступныя дзве гульні нашы каманды правялі ў горадзе Каунасе. З лікам 3:1 рабяты нашага універсітэта выйгралі ў каманды політэхнікаў. Такі ж лік быў зафіксіраваны і ў наступны дзень, але на карысць гаспадароў пляцоўкі, зборнай каманды горада Каўнаса. Нашы дзяўчаты ўступілі дзве перамогі. У першы дзень—дзяўчатам політэхнічнага інстытута, на другі — зборнай камандзе горада. Гульні прайшлі з нязначнай перавагай нашых саперніц.

Сустрэчы з такімі моцнымі сапернікамі, як літоўскія каманды, былі вельмі карыснымі для нашых ігракоў і трэнераў каманд. Стала зразумелым, у якім напрамку патрэбна працаваць далей, на апрацоўку якіх элементаў і прыёмаў звярнуць найбольшую ўвагу.

Маральна-валявыя якасці ігракоў праяўляюцца толькі ў сустрэчах з моцным сапернікам. Таму такія гульні нам патрэбна часцей праводзіць. Хацелася б паведаміць аматарам валейболу, што ў канцы красавіка да нас ва універсітэт прыедуць мужчынская і жаночая каманды па валейболу Каўнаскага політэхнічнага інстытута. Мы спадзяемся, што знойдзецца шмат балельшчыкаў, якія наведаюць гэтыя гульні і атрымаюць вялікае задавальненне.

У час знаходжання ў літоўскіх сяброў мы азнаёміліся з лепшымі мясцінамі горада Вільнюса, пабывалі ў гістарычным музеі, карцінннай галерэі. У горадзе Каўнасе зрабілі экскурсію ў Дзевяты форт, былы канцлагер у час Айчыннай вайны, а зараз музей.

Наперадзе ў нашых валейбалістаў адказныя гульні ў каляндарных і таварысцкіх сустрэчах.

**М. КУЧЫНСКІ,**
**старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**



# МАЛЮНКІ ХАРАСТВА

Штогод у гэтыя вясновыя дні ў сталіцы нашай рэспублікі Мінску праводзяцца спаборніцтвы па гімнастыцы на першынство горада. Прыгожыя, віртуозныя спартыўныя ўзоры гімнастаў заўсёды выклікаюць цікавасць гледачоў. Але аўдыторыя ніколі не збірала іх столькі, як на спаборніцтва ў гэтым годзе, якое прахадзіла два дні ў спартыўнай зале нашага універсітэта. Тут сустрэліся мацнейшыя калектывы горада, «Чырвонага сцяга», «Працоўных рэзерваў», «СКА», «Буравесніка».

Цяжкая і упартая была барацьба. Заслужаную перамогу атрымаў добра падрыхтаваны калектыў «Буравесніка». За яго ад нашага універсітэта выдатна выступілі Юра Міхайлоўскі, Леанід Бахманаў, Іра Пахрыцына, Валя Камісарава.

**На здымках:** 1. Практыкаванне на бервяне выконвае Іра Пахрыцына.

2. Апорны скачок выконвае Леанід Бахмачоў.

**Фота і тэкст А. КАДЗЕТА.**



**50-ГОДДЗЮ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА**

16 КРАСАВІКА, У НЯДЗЕЛЮ, А 16 ГАДЗІНЕ ДНЯ, У НАШЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ БУДЗЕ ПРАВЕДЗЕНЫ МАСАВЫ КРОС, ПРЫСВЕЧАНЫ 50-ГОДДЗЮ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ, 19 КРАСАВІКА ФІНАЛ НА ДЫСТАНЦЫЮ — ЖАНЧЫНЫ — 1.000 МЕТРАЎ, МУЖЧЫНЫ — 3.000 МЕТРАЎ.
УСЕ НА КРОС, ТАВАРЫШЫ!

# МЕЛОДЫІ ФЕСТЫВАЛЮ



*Усе з нецярплівасцю чакалі гэтага дня — дня, калі будуць названы лепшыя калектывы, якія сустрэнуцца ў апошнім заключным этапе агляду мастацкай самадзейнасці вышэйшых навучальных устаноў сталіцы, тэхнікумаў, заводаў, фабрык і розных іншых устаноў. І вось 8 красавіка поўная зала Акругавага Дома афіцэраў БВА змагла зачароўвацца мастацтвам артыстаў-студэнтаў, артыстаў-рабочых, артыстаў-будаўнікоў...*

*Мы ўжо паведамлялі раней, таварышы, што самадзейнае мастацтва нашага універсітэта атрымала вялікае прызнанне ў Ленінградзе на аглядзе вну Савецкага Саюза, дзе наш калектыў заняў агульнае чацвёртае месца. Гэта вялікі і заслужаны поспех! Выдатна дэбютыравалі нашы самадзейныя артысты і на званне лепшых сталіцы. Гэтае права заслужылі Народная харавая капэла (кіраўнік А. Білібін), Народны аркестр народных інструментаў (кіраўнік М. Лісіцын), вакальны квартэт «Вяснушкі» (кіраўнік А. Вальнштэйн), танцавальны калектыў (кіраўнік Л. Аляксютовіч).*

*Прыкладам сапраўднага прызнання высокага мастацкага выканання, непаўторнай арганічнай адзінасці і ўмення была наша харавая капэла. Гэты калектыў прызнаны адным з лепшых горада. А колькі шчырых апладысментаў выклікала ў прысутных выкананне праграмы вакальнага квартэту «Вяснушкі»!.. Старанна, з вялікім майстэрствам танцавальную пантаніму «Афрыка, якая абуджаецца» выканаў удзельнік мастацкай самадзейнасці універсітэта А. Дзегцяроў (яго вы бачыце на нашым здымку злева). У ліку лепшых аб'яўлена і студэнтка С. Дубоўская, якая цудоўна прачытала ўрывак з казкі «Прыгоды Бураціна». Выдатна выступілі і іншыя калектывы БДУ.*

*НА ЗДЫМКУ: (унізе) фрагмент з танца «Кола» выконваюць танцоры універсітэта.*

*Фота і тэкст А. Кадзета.*



# ПЕРАМОГУ ІНІЦЫЯТАРАМ ТРАДЫЦЫІ

**Ужо дзесяць гадоў па традыцыі ў Мінску праводзіцца Ленінская эстафета лёгкаатлетаў. Яе маршруты пралягаюць па цэнтральных вуліцах горада.**

**У ёй прымаюць удзел мацнейшыя спартыўныя калектывы вышэйшых і сярэдніх навуковых устаноў, прадпрыемстваў.**

**Важна падкрэсліць, што стваральнікамі гэтай традыцыі былі спартсмены нашага універсітэта, якія выйгравалі першынство на працягу васьмі гадоў.**

**22 красавіка — у дзень нараджэння У. І. Леніна, універсітэцкія бягуны ў дзесяты раз выйдуць на фінішныя прамыя.**

# СЕМДЗЕСЯТ ВЁСНАЎ



15 красавіка споўніцца 70 гадоў з дня нараджэння доктара юрыдычных навук прафесара Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна Файфеля Ісакавіча Гаўзе, які з'яўляецца высокакваліфікаваным спецыялістам у галіне грамадзянскага права.

У 1921 годзе Файфель Ісакавіч закончыў прававое аддзяленне Харкаўскага інстытута народнай гаспадаркі.

Па заканчэнню яго на працягу многіх год (з 1921 па 1929) працаваў у дзяржаўным апараце БССР — следчым па важнейшых справах, загадчыкам аддзела заканадаўчых устаноў і кадыфікацыі Народнага Камісарыята юстыцыі БССР, членам Камісіі заканадаўчых прапаноў і рэдактарам-кансультантам Савета Народных Камісараў БССР.

Ф. І. Гаўзе прымаў актыўны ўдзел у распрацоўцы праектаў кодэксаў БССР і іншных заканадаўчых актаў, якія выдаваліся ў той перыяд, у арганізацыі выдання збору законаў БССР, удзельнічаў у рабоце Урадавай камісіі БССР па падрыхтоўцы праекта Канстытуцыі Саюза ССР 1924 года. Ён быў адным з рэдактараў юрыдычнага часопіса «Весці НКЮ», што выдаваўся ў Беларусі.

На працягу 44 год ён вядзе педагагічную і навукова-даследчую работу ў вну: у Беларускім дзяржаўным універсітэце, у Мінскім юрыдычным інстытуце, у перыяд Вялікай Айчыннай вайны—у Алма-Ацінскім юрыдычным інстытуце.

У сваёй шматгадовай плённай педагагічнай і навукова-даследчай дзейнасці Ф. І. Гаўзе многа працы і энергіі прылажыў у справу развіцця вышэйшай юрыдычнай адукацыі ў Савецкай Беларусі, падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі юрыдычных кадраў, распрацоўкі, удасканелення і кадыфікацыі заканадаўства рэспублікі, даследаванню станаўлення і развіцця Беларускай нацыянальнай савецкай дзяржаўнасці, створанай у выніку Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Навукова-даследчая дзейнасць Ф. І. Гаўзе прысвечана галоўным чынам распрацоўцы праблемы савецкага дзяржаўнага грамадзянска-прававога дагавору і пытанням развіцця і кадыфікацыі заканадаўства БССР. Па пытаннях грамадзянскага права апублікавана 36 навуковых работ.

У 1962 годзе ім абаронена доктарская дысертацыя на тэму: «Савецкі грамадзянска-прававы дагавор».

Сваю навукова-педагагічную дзейнасць Ф. І. Гаўзе на працягу некалькіх гадоў спалучаў з арганізатарскай дзейнасцю ў якасці дэкана і загадчыка кафедры грамадзянскага права. Ён пастаянна падтрымлівае цесную сувязь з практыкай, у цяперашні час удзельнічае ў рабоце Навукова-метадычнага Савета Вярхоўнага суда БССР і грамадскага Савета па прававых пытаннях пры Прэзідыуме Вярхоўнага Савета БССР.

Ф. І. Гаўзе выбіраўся дэпутатам Мінскага гарадскога Савета, членам і старшынёй таварысцкага суда БДУ, а таксама ў склад розных прафсаюзных органаў. Ён сістэматычна выступае з лекцыямі сярод практычных работнікаў органаў суда, арбітража, пракуратуры, у Мінскім грамадскім універсітэце прававых ведаў.

Ва ўсёй сваёй навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці Ф. І. Гаўзе паказвае прыклад высокай патрабавальнасці, добрасумленнага выканання службовых абавязкаў і заслужана карыстаецца вялікай павагай у калектыве.

З 70-годдзем, паважаны Файфель Ісакавіч!

**М. МЕРКУШАЎ.**

**Рэдактар М. І. ЮСЬКА.**

АТ 17325. **Адрас рэдакцыі: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, І паверх, п. 106, тэл. Б-2-07-19, Друкарня выдавецтва «Звязда».** Зак. 735.